7/3 N1

ISSN 0203-2031

# Адукацыя і Выхаванне

**У нумары:**

*Вялікая любоў да малой Радзімы*

*Жыццё чалавека пад аховай закону*

*Мова бацькоўскай любві*

*Рэфлексіўная пазіцыя будучага педагога*

*Маральна-выхаваўчы патэнцыял народнай педагогікі*

*Педагагічная дыскусія 1928–1931 гадоў*

4 · 2009

# Маральна-выхаваўчы патэнцыял народнай педагогікі Мазырскага Палесся

В.С.Болбас

**Абапіраючыся на фальклорную спадчыну Мазырскага Палесся, аўтар раскрывае этыка-педагагічны аспект традыцыйнай культуры рэгёна, вызначае мэты, змест, асноўныя прынцыпы і метады, а таксама некаторыя асаблівасці маральнага выхавання ў народнай педагогіцы палешукоў.**

*Абгрунтаваная патрэбамі развіцця сучаснай педагагічнай тэорыі і практыкі цікаўнасць даследчыкаў да традыцыйнай народнай культуры ўвогуле ў апошні час усё часцей звяртаецца да вывучэння яе* **рэгіянальных асаблівасцей***, што ў адпаведнасці з прынцыпам культуразгоднасці выхавання павінна павысіць эфектыўнасць апошняга.*

*На беларускіх землях здаўна па шэрагу сацыяльна-культурных характарыстык выдзяляецца Палессе, а ў ім – Мазырска-Прыпяцкі рэгіён. Сістэматычнае вывучэнне яго самабытнай матэрыяльнай і духоўнай культуры было пачата ў XIX стагоддзі такімі этнографамі, як З.Я. Даленга-Хадоўскі (Адам Чарноцкі), А.К. Кіркор, П.М. Шпілеўскі, М.В. Радзевіч, А.Н. Шыманоўскі, і было прадоўжана ў XX стагоддзі Е.А. Раманавым, У.Г. Пяткевічам, Я.Ф. Карскім, Іосіфам і Яўхімам Яленскімі, А.К. Сержпутоўскім, М.В. Доўнар-Запольскім, І.А. Сербавым. У савецкі час гэтай праблеме прысвяцілі свае працы В.К. Бандарчык, І.М. Браім, М.Я. Грынблат, Г.М. Курыловіч, Н.І. Лебедзева, З.Я. Мажэйка і іншыя. У сучасны момант актыўныя даследаванні вядуць многія навукоўцы. Сярод іх – А.В. Гурко, А.У. Гурко, К.П. Кабашнікаў, Г.І. Каспяровіч, Л.В. Ракава, Я.Н. Сахута, І.У. Чаквін, І.Ф. Штэйнер і іншыя.*

*Навукоўцамі сабраныя і сістэматызаваныя многія набыткі самабытнай матэрыяльнай і духоўнай культуры палешукоў. Але, як паказваюць фальклорныя экспедыцыі, што пастаянна арганізуюцца ў апошні час Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя І.П. Шамякіна (ды і не толькі ім), скарбонка народнай мудрасці і шматвяковага вопыту невычарпальная. Важна таксама зазначыць, што аналіз духоўнай спадчыны Мазырскага Палесся з маральна-выхаваўчага пункту гледжання пакуль што не праводзіўся ў гісторыка-педагагічнай навуцы.*

Я.Ф. Карскі адносіў Прыпяцкае Палессе да прарадзімы славянскіх народаў. З прычыны прыродна-кліматычных і сацыяльна-палітычных фактараў у пойме ракі Прыпяць існавала свая замкнёная прастора з даволі нязначным уплывам звонку. Тут была сфарміравана непаўторная традыцыйна-побытавая культура, найважнейшым аспектам якой з'яўляецца педагагічны. Быў назапашаны шматвяковы вопыт гадавання дзяцей, які беражліва захоўваўся і перадаваўся з пакалення ў пакаленне, ствараў трывалы падмурак грамадскага суіснавання і засцерагаў ад непрадуманых новаўвядзенняў у выхаваўчай справе.

Адной з характэрных асаблівасцей народна-выхаваўчай спадчыны палешукоў з'яўляецца вылучэнне ў якасці галоўнай

выхаваўчай задачы **фарміраванне асобы з высокім духоўна-маральным узроўнем.** Пры вывучэнні маральнай і духоўнай культуры Мазырскага Палесся вядомы этнограф XIX стагоддзя І.А. Сербаў адзначаў, што маральна-духоўныя якасці і чысціня нораваў беларусаў павінны стаць прыкладам для ўсіх жыхароў Расійскай імперыі [11, с. 48]. Высакародства палешукоў, на яго думку, пераўзыходзіць лепшыя якасці еўрапейскіх рыцараў сярэднявечча.

Найважнейшым складальнікам выхавання на Мазырскім Палессі з'яўляецца **развіццё абшчынна-таварыскай, калектывісцкай арыентацыі** кожнага індывіда. Не зусім спрыяльныя ўмовы для земляробства і жывёлагадоўлі садзейнічалі аб'яднанню людзей у пэўныя супольнасці. *«Калі робіш у купе, не баліць у пупе»* [9, с. 204], *«Адным пальцам вузел не завяжаш»* [15] – прыходзілі да высновы нашы продкі.

Хрысціянства хоць і надало новае гучанне калектывізму, саборнасці, але разам з тым заклала падмурак для развіцця ідэй індывідуалізму. Хрысціянскія запаветы звяртаюцца перш за ўсё да ўнутранага свету асобнага чалавека, да яго ўласнага сумлення. На Палессі ж, як нідзе ў іншых месцах, хрысціянскае веравучэнне прыстасоўвалася да язычніцкіх уяўленняў. Тут уласная годнасць, асабістае шчасце разглядаліся толькі ў рэчышчы імкнення да агульнага дабра, задавальнення інтарэсаў усяго грамадства: *«Адзін з'еш хоць вала – адна хвала»* [13], *«За агульным сталом яда смачней»* [26].

З язычніцкіх часоў каштоўнасць чалавека заключалася не столькі ў якасцях канкрэтнага індывіда, колькі ў тым, што ён уяўляе як часцінка пэўнай супольнасці. Асабістыя якасці не сказаць, што не цаніліся, але разглядаліся з пазіцыі іх вартасці для ўсяго грамадства. Само паняцце дабра разглядалася як карысць для іншых. *«Худо таму, хто не робіць дабра нікаму»* [22] – перасцерагалі палешукі. Фальклорная скарбонка народнай мудрасці напаўняла выхаваўчыя пастулаты канкрэтным зместам, які сведчыў аб пераваге калектыўнага ладу жыцця. У адной з казак, запісанай А.К. Сержпутоўскім на Палессі, гэта агучваецца так: *«І пачаў Асілак навучаць, каб людзі жылі ў згодзе да ў ласцэ. Тады, кажа, ніякае ліха з імі не справіцца, бо згодная грамада, бы адзін вялікі чалавек, вялікі багатыр, дужэйшы за ўсіх багатыроў»* [12,с. 89].



*Валерый Сяргеевіч Болбас,*
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт, першы прарэктар Мазырскага*
*дзяржаўнага педагагічнага*
*універсітэта імя І.П. Шамякіна*

Нават Адраджэнне з яго накіраванасцю на індывідуалізм у значна меншай ступені закранула Палессе ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны. Калектыўны лад жыцця выпрацаваў цікавыя формы арганізацыі побыту. Так, сход аднавяскоўцаў не толькі вырашаў праблемы, агульныя для ўсіх жыхароў, але і мог прымаць рашэнні ў дачыненні да асобнай сям'і і канкрэтнага чалавека.

Падмацаваная асноўнымі пастулатамі хрысціянскай этыкі схільнасць да «агульнага дабра» з'яўлялася характарыстычнай якасцю палешукоў і вызначала іх адносіны паміж сабой. Чалавекалюбства распаўсюджвалася не толькі на блізкіх, аднавяскоўцаў, аднаверцаў, але і на прадстаўнікоў іншых народаў, людзей другіх веравызнанняў. Наведвальнікі вёсак, што размясціліся сярод непраходных балот, адзначалі шчырую гасціннасць іх жыхароў. *«Госць у хаце – Бог у хаце»* [9, с. 345] – лічылі палешукі. Гаспадар быў гатовы апошнім падзяліцца са сваім госцем.

Як і ў іншых народаў, грамадскае ўладкаванне ва ўяўленні жыхароў Палесся павінна грунтавацца на **справядлівасці,** якая выступае рэгулятарам чалавечых узаемаадносін і арыенцірам іх удаскана-

лення. Найважнейшай маральнай якасцю кожнага індывіда лічылася **праўдзівасць**. Яе выхаванню ўдзялялася значная ўвага: *«Не чын паважаюць, а чалавека па яго праўдзе»* [18], *«Праўдаю найдалей дойдзеш»* [13], *«Раз няпраўда ці ашука, а сумленню на век мука»* [19].

Высокім этычным пачаткам напоўнены не толькі людскія ўзаемаадносіны, але і адносіны да жывой і нежывой прыроды: *«Хто заб'е бабра, не будзе мець дабра»* [6, с. 244]. Арганічная злучанасць з прыродай спарадзіла ў нашых продкаў яе адухаўленне. На звяроў, птушак і іншых жывых істот паляшук глядзіць як на братоў меншых. Дрэвы, расліны таксама адухаўляюцца, надзяляюцца чалавечымі якасцямі. Вельмі часта ў фальклоры прадстаўнікі жывой і нежывой прыроды як носьбіты каштоўнасных арыентацый, характэрных для грамадства, выступалі ў якасці ідэала маральнага ўдасканалення. Ужываючы сучасны лексікон, можна сцвярджаць, што **экалагічны аспект** маральнага выхавання на Мазырскім Палессі і сёння з'яўляецца ўзорам беражлівых адносін да прыродных багаццяў.

**Патрыятызм** у палешукоў мае больш абмежаваны характар, чым у прадстаўнікоў іншых рэгіёнаў. Звычайна ён зводзіцца да паняцця навакольнай рэчаіснасці. Радзіма, Бацькаўшчына прадстае ў выглядзе *«роднага краю»*, *«мілага куточка»*, *«сваёй вёскі»*, *«бацькоўскай хаты»*. Лакальная абмежаванасць патрыятызму дапаўнялася яго лірычным характарам, які праяўляўся ў замілаванні навакольнымі краявідамі: *«Кожнаму свой куток мілы»* [24], *«Родная зямелька як змораному пасцелька»* [16], *«Родная зямелька мякчэй за чужую пярыну»* [22], *«Няма смачней вадзіцы як з роднае крыніцы»* [13]. Іншыя ж мясціны не толькі не вабілі, а нават выклікалі адмоўныя адносіны, выступалі ў якасці «чужой, нялюбай старонкі»: *«У чужым краю песні не пяю»* [6, с. 243], *«На чужыне і лаза вочы дзярэ»* [16]. Нічым нельга было спакусіць палешука пакінуць землі продкаў. *«Бацькаўшчыну не купляюць і не прадаюць»* [10, с. 156] – катэгарычна заключалі на Палессі.

**Маральны ідэал** палешукоў уяўляў шматбакова развітую, дабрачынную, цнатлівую асобу з высокім узроўнем духоўнасці. Цікава адзначыць, што разам з агульнапрынятымі маральнымі якасцямі, такімі як добразычлівасць, міласэрнасць, сумленнасць, сціпласць, даверлівасць, абавязковасць, надзейнасць, памяркоўнасць, разважлівасць, цярплівасць, акцэнтавалася ўвага і на пачуцці ўласнай годнасці. Палешукі лічылі, што *«хто гнецца, таго і гнуць»* [6, с. 244], а залішняя цярплівасць можа перайсці ў раз'юшаны гнеў.

Геаграфічна-кліматычныя ўмовы садзейнічалі фарміраванню ў жыхароў Палесся такіх якасцей, як упартасць, вынослівасць, імкненне даводзіць распачатую справу да канца. Адсутнасць бяскрайніх прастораў, абмежаванасць навакольнага асяроддзя спарадзілі ў палешукоў такія якасці, як стрыманасць, нерашучасць, меланхалічнасць, кансерватызм, насцярожанасць, замкнёнасць. У свядомасці насельнікаў Палесся істотнае месца займаюць міфалагічна-містычныя, ірацыянальныя ўяўленні – забабоны, прымхі. Даследчыкі адзначаюць прыкметную «спавернутасць» менталітэту нашых продкаў да мінулага, былых нормаў жыцця і традыцый [5, с. 80].

Важнае месца адводзілася на Палессі выхаванню павагі да старэйшых, звычкі шанаваць бацькоў. Вакол дзяцей стваралася адпаведная атмасфера, насычаная настаўленнямі:

*Бацьку з маткай любі,*
*Людным будзеш тады.*
*Дзеда з бацькам шануй,*
*Так і дзетак гадуй* [17].

Непаважлівыя адносіны да бацькоў прыраўноўваліся да самага цяжкага граху. Лічылася, што гэта прыводзіць да згубных наступстваў: *«Хто бацьку і маці зневажае, той дабра не знае»* [16]. Нават дарослыя дзеці, якія ўжо мелі сваіх дзяцей, ва ўсім безумоўна слухаліся састарэлых бацькоў.

Сур'ёзную ўвагу ўдзялялі палешукі **разумоваму выхаванню**. Яго змест прадугледжваў развіццё назіральнасці, памяці, самастойнасці мыслення, набыццё жыццёвага і прафесійнага вопыту, фарміраванне цікаўнасці да разумовай дзейнасці. З ранняга ўзросту дзіця знаёмілі з навакольным светам, вучылі лічбам і арыфметычным дзеянням, узбройвалі ведамі ў вобласці народнай медыцыны, метэаралогіі

і інш. На развіццё інтэлектуальных здольнасцей непасрэдна накіраваны загадкі, задачызагадкі. Многія фальклорныя творы даказваюць перавагу розуму над іншымі чалавечымі якасцямі: *«Не сілай, а розумам»* [21], *«Рукі да работы, ногі да ахвоты, галава да ўсяго»* [25]. Нягледзячы на тое што спадчыннасці надавалася важнае значэнне, лічылі, што шляхам уласных намаганняў і з дапамогай настаўніка выхаванец многага можа дабіцца ў сваім развіцці. З павагай ставіліся на Палессі да ведаў, адукаванасці, кнігі. У XIX стагоддзі ў адной з палескіх вёсак запісана такая прыказка аб кнізе: *«Бывъ собі дурень на дошку дывывса, зробывса розумный»* [8, с. 169]. Аналагічны змест маюць многія іншыя прыказкі і прымаўкі: *«Не той многа ведае, хто доўга жыў, а той, хто многа вучыўся»* [25], *«Вучоны водзіць, а невучоны за ім следам ходзіць»* [25], *«Не кручаны не рамень, не вучаны не чалавек»* [14], *«У каго веды, у таго і сіла»* [17], *«Навука не мучыць, а жыць вучыць»* [18], *«Вучыся, каб дурні зваліся»* [16].

Палявыя даследаванні паказваюць, што ў палешукоў да сённяшняга дня захаваліся замовы для павышэння эфектыўнасці выхавання і навучання: *«Прэсвятая Уладычыца Дзева Багародзіца, спасі і сахрані маіх дзетачак* (пералічваюцца імёны) *пад тваім кровам, спасі і сахрані ўсіх отракаў і отракавіц, младзенцаў, хрышчоных і нехрышчоных, і ў чрэві Мацеры насімых укрый іх рызаю тваёю, саблюдзі іх у страху Божаму і паслушанію радзіцелям сваім, умалі Госпада майго і сына Твайго, каб даравай розум і спасенне»* [19]; для школьнага навучання: *«Ісціна і праўда ў тому, што за гэтым парогам мая сіла»* (гаварыць тры разы перад тым, як зайсці ў школу) [21].

Шмат клопату праяўлялі палешукі і аб здароўі дзяцей. Хоць **фізічнае выхаванне**, як правіла, не вычлянялася ў самастойны працэс, але і ў працы, і ў гульнях, якія былі насычаны фізічнымі нагрузкамі, хлапчукі і дзяўчынкі гартаваліся і развіваліся. Здароўе разглядалася як натуральны прыродны стан чалавека, аснова чалавечага жыцця і матэрыяльнага дастатку. Міхалон Літвін, аўтар сацыяльна-палітычнага трактата «Аб норавах татар, літоўцаў і маскавіцян», надрукавана ў 1615 годзе, зазначае, што людзі, якія жывуць на беразе ракі Пціч, з малых гадоў прывыкаюць плаваць, лавіць рыбу, паляваць. Пастаянныя практыкаванні спрыяюць загартоўцы прыроджаных фізічных якасцей і асаблівасцей характару: спрыту, сілы, смеласці, стойкасці і самаахвярнасці. З тых, хто прывык да небяспекі, вырастаюць дужыя і смелыя воіны, здольныя абараніць дзяржаву [4, с. 48].

У вуснай народнай творчасці існуе шмат твораў, у якіх апяваюцца дужыя людзі, асілкі, волаты. Пры гэтым яны абавязкова змагаюцца супраць зла, выступаюць у якасці абаронцаў інтарэсаў грамадства.

Многіх даследчыкаў захапляюць **адносіны палешукоў да прыгожага.** Эстэтыка прысутнічала практычна ўсюды: у штодзённым побыце, святах, ва ўсіх элементах матэрыяльнай і духоўнай культуры. Упрыгожваўся сам будынак хаты: канёк даху, аканіцы, ганак. Аздабляліся разьбой прылады працы, мэбля, посуд. Асаблівая роля ў эстэтычным выхаванні належала народнаму святочнаму касцюму. Наогул, прыгожыя рэчы, зробленыя бацькамі ці далёкімі продкамі, захоўваліся ў сям'і як рэліквія. Фарміраванне эстэтычнага густу было падпарадкавана задачы выхавання дабрадзейнасці. Добрае і прыгожае ў народзе былі паняццямі тоеснымі.

Няпростыя ўмовы жыцця сфарміравалі ў мазырскіх палешукоў незвычайнае працалюбства, вынослівасць, цярплівасць. Наданне гэтым якасцям грамадскай значнасці пэўным чынам абумовіла змест традыцыйнага народнага выхавання. Практычна на кожным этапе сталення дзяцей вылучаліся канкрэтныя выхаваўчыя задачы. Стрыжнем і важнейшым змястоўным напаўненнем народнага выхавання заўсёды з'яўлялася **працоўнае.** Гэта дае падставу многім даследчыкам увогуле народную педагогіку лічыць педагогікай працы [1, с. 57]. Хаця трэба адзначыць, што такі падыход назіраецца не ва ўсіх чалавечых супольнасцях. Гісторыя асобных народаў дае нам прыклады, калі ў якасці прыярытэтных вылучаліся іншыя бакі жыцця грамадства. У некаторых соцыумах існавалі грэблівыя адносіны да працы, у першую чаргу фізічнай, калі апошняя разглядалася ў якасці пакарання. Падобных праяў у палешукоў ніколі

не назіралася. Каляндарна-абрадавая паэзія Мазырскага Палесся самае ганаровае месца адводзіць працы і адпаведным адносінам да яе. У іерархіі маральных каштоўнасцей бясспрэчны прыярытэт аддаваўся працалюбству. Прычым адносіны да працы напаўняліся высокім этычным сэнсам: «*Менш гавары, ды больш рабі*» [6, с. 234], «*Работа хлеб салодзіць*» [6, с. 239], «*Работа чалавека лечыць*» [6, с. 240], «*Хто з работай дружыць, той жыве і не тужыць*» [19], «*Хто працуе, таму і шануе*» [23].

Уключэнне дзяцей у працоўную дзейнасць адбывалася паступова, пачынаючы з самага ранняга дзяцінства. Ужо пяцігадовыя дзеці мелі пэўныя даручэнні, часовыя і пастаянныя. Гэта была не «гульня ў працу», а рэальная вытворча-карысная працоўная дзейнасць. Па меры сталення дзяцей іх удзел у вядзенні гаспадаркі пашыраўся. Ужо ў падлеткавым узросце яны валодалі пэўнымі прафесійнымі ўменнямі і навыкамі, нароўні з дарослымі ўключаліся практычна ва ўсе віды працоўнай дзейнасці. Ранняе далучэнне дзяцей да працы садзейнічала таксама фарміраванню ў іх грамадска значных, маральна-валявых, інтэлектуальна-разумовых, эстэтычных і іншых якасцей.

Духоўныя якасці палешукоў яскрава праяўляюцца праз **шчырую нефармальную веру ў Бога**, якая носіць ярка выражаны інтравертны характар і менш, чым у вернікаў з другіх рэгіёнаў Беларусі, залежыць ад афіцыйнай царквы. Вера не столькі падпарадкоўваецца царкоўна-абрадавым нормам, колькі выступае ў якасці ўласнага сумлення, маральна-духоўнага абавязку перад Творцай, людзьмі і самім сабой. «*Бог з пугаю не стаіць, як хочаш можаш жыць*» – заключалі ў народзе [6, с. 227].

На Палессі народныя вераванні, што існавалі з часоў язычніцтва, арганічна перапляліся з асноўнымі пастулатамі хрысціянскага веравучэння. Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў патрабаванні **актыўнадзейснай пазіцыі асобы** ў жыцці: «*Меней словам, болей справай*» [24]. Калі маральнасць не ўвасаблялася ў канкрэтных справах, то яна ператваралася ў знешнюю манернасць, якая невысока цанілася ў народзе. Так, напрыклад, якой бы лірычнасцю ні характарызаваўся патрыятызм палешукоў, а ўсё ж, у рэшце рэшт, адносіны да радзімы вызначаліся добрымі для яе справамі. «*Той Бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна служыць*» [18] – гаварылі ў народзе.

Даследчыкі традыцыйна-побытавай культуры Мазырскага Палесся адзначаюць даволі высокае, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі, **становішча жанчын**. Тут яны карысталіся грамадскай павагай і мелі значна больш свабоды, чым у іншых рэгіёнах краіны. Асабліва ярка праяўлялася роля жанчыны ў гадаванні дзяцей. Дзякуючы яе актыўнаму ўдзелу ў выхаванні фарміраваліся такія якасці палешукоў, як гуманнасць, добразычлівасць, мяккасць характару, разважлівасць, памяркоўнасць і інш.

Шматвяковы народна-педагагічны вопыт выпрацоўваў свае спосабы дасягнення выхаваўчых мэт. З цягам часу была распрацавана сукупнасць патрабаванняў да арганізацыі выхаваўчага працэсу, што істотна павышала яго выніковасць. Адметнасцю гэтых патрабаванняў было тое, што яны ўлічвалі не толькі індывідуальныя і ўзроставыя асаблівасці дзіцяці, але і традыцыйна-побытавыя ўмовы яго развіцця, а таксама спецыфіку культуры, яе нацыянальныя і рэгіянальныя адметнасці.

Адзначаная вышэй цесная сувязь з навакольным асяроддзем дазволіла будаваць увесь выхаваўчы працэс у строгай адпаведнасці з прыродай. **Прынцып прыродаўзгодненасці** выхавання выкарыстоўваўся ў палешукоў шматпланава. Па-першае, пастаянна ўлічваўся фактар спадчыннасці: «*Які куст, такі і адростак*» [18], «*Бацька – рыбак, і дзеці ў ваду глядзяць*» [14], «*На вярбе грушы не растуць*» [15]. Па-другое, выхаванне абапіралася на прыроду чалавека – полаўзроставыя і індывідуальныя асаблівасці дзяцей: «*Дзеткі аднае маткі, ды не роўныя*» [6, с. 133], «*Якія годы, такі і розум*» [6, с. 136], «*Дзеці дзецям розніца*» [19]. Па-трэцяе, многія прынцыпы развіцця жывой прыроды па аналогіі пераносіліся і на выхаванне дзяцей: «*Гні галінку, пакуль маладзенькая*» [19], «*Дзіця як цесто, як замяшаў, так і вырасце*» [14], «*Гэта яшчэ цвет, а ягады будуць*» [10, с. 234].

Выхаванне хлопчыкаў і дзяўчынак

мела такія істотныя адрозненні, што можна гаварыць аб існаванні двух самастойных выхаваўчых працэсаў, кожны з якіх меў свае мэты і сродкі. Калі з хлопчыкаў выхоўвалі гаспадароў, на плечы якіх ускладвалася асноўная адказнасць за сямейны дабрабыт, то з дзяўчынак павінны былі вырасці руплівыя гаспадыні, якія дапамагалі мужу ва ўсіх справах [7, с. 57].

Прынцып сувязі выхавання з жыццём быў настолькі ярка выражаным, што ў традыцыйнай педагагічнай культуры выхаванне амаль не выдзяляецца ў самастойны працэс. У гэтым сэнсе народнае выхаванне амаль тоесна сучаснаму разуменню сацыялізацыі асобы.

Навукоўцы, якія даследавалі жыццё, побыт і норавы палешукоў, адзначалі, што важнай умовай эфектыўнасці народнай педагогікі былі адзінства, пастаянства і нефармальная **ўзгодненасць выхаваўчых намаганняў** усіх, хто меў прамое ці ўскоснае дачыненне да гадавання дзяцей. На мове палешукоў гэта гучала як «*біць у адзін хамут*» [24]. Міжпакаленная сувязь у сем'ях была вельмі цеснай. У выхаванні самы актыўны ўдзел прымалі бабулі і дзядулі, дзядзькі і цёткі, іншыя кроўныя сваякі. Кола выхавацеляў пашыралася і за кошт названых сваякоў – хросных, бабкі-павітухі. Не заставаліся ўбаку ад выхаваўчых працэсаў суседзі, аднавяскоўцы. З пазіцый сучаснасці можна сказаць, што адбывалася педагагізацыя навакольнага асяроддзя. І ўсё ж прыярытэт у выхаванні належаў сям'і. «*Не навучыў бацька, не навучыць і дзядзька*» [16] – прыходзілі да высновы на Палессі.

Адной з істотных адметнасцей народнай педагогікі Палесся з'яўляюцца досыць **мяккія, добразычлівыя адносіны да дзяцей:** «*Ласка горы разбівае*» [21], «*Няшчасныя тыя дзіцяткі, якіх не жураць ні бацькі, ні маткі*» [6, с. 134], «*Як не дапаможаш слаўцом, то і не дапаможаш дубцом*» [21], «*Крыкам дзіця не вучаць*» [25], «*Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі*» [14], «*Ад дубцоў дурнеюць, ад слоўцаў разумеюць*» – лічылі палешукі [10, с. 99]. Фізічныя пакаранні выкарыстоўваліся толькі ў выпадку выражанага непаслухмянства, пры выхаванні дзяўчынак – крайне рэдка. Часцей за ўсё іх замянялі патрабаванні, запалохванне, пагрозы: «*Не паможа кій – не паможа і кій*» – зазначала народная педагогіка [19].

Традыцыйная педагагічная культура Мазырскага Палесся ў маральным выхаванні няўхільна прытрымлівалася **прынцыпу сістэматычнасці.** У народзе існавала перакананне, што настойлівасць і ўпартасць абавязкова прывядуць да маральнага ўдасканалення асобы: «*Капля камень не сілай доўбіць, а як часта на яго падае*» [24], «*Ціхая вада берагі рве*» [6, с. 244].

Асаблівасці сялянскага побыту, сувязь вусна-паэтычнай творчасці з каляндарна-абрадавай дзейнасцю вылучалі ў якасці аднаго з ключавых прынцыпаў выхавання **прынцып цыклічнасці.** З яго дапамогай адбываліся замацаванне і далейшае развіццё маральнай свядомасці выхаванцаў. Як адзначае заснавальнік этнапедагагічных даследаванняў у былым СССР Г.Н. Волкаў, «...праграма выхавання была размеркаванай па гадах, месяцах і нават днях тыдня» [3, с. 59].

Надзвычайным багаццем вызначаецца народная педагогіка палешукоў у арсенале метадаў, прыёмаў, сродкаў і формаў маральнага выхавання. Як і ўвогуле ў народным выхаванні, на Палессі адной з умоў эфектыўнасці выхаваўчага працэсу з'яўлялася яго **апора на традыцыі**. Шматлікія народныя традыцыі з іх усеагульнасцю, устойлівасцю ў часе, эмацыянальнай прывабнасцю з'яўляліся эфектыўнымі сродкамі маральнага выхавання. Традыцыяналізм забяспечваў выкарыстанне дзейсных, апрабаваных выхаваўчых сродкаў, шматкратнае ўздзеянне на дзяцей, паўтараемасць падыходаў на працягу многіх пакаленняў. Такім чынам традыцыяналізм замацоўваў і развіваў маральную культуру як у межах аднаго канкрэтнага пакалення, так і на працягу гістарычнага развіцця этнасу ўвогуле. Традыцыі продкаў беражліва захоўваліся, новаўвядзенні не ламалі іх, а дапаўнялі і ўзбагачалі.

У адрозненне ад акадэмічнай педагогікі народна-выхаваўчая сістэма палешукоў прыярытэт аддавала **метаду практыкаванняў**, ці прывучэння. На эмпірычным узроўні было заўважана, што адпаведныя дзеянні, учынкі, якія шматкратна паўтараюцца, фарміруюць

звычкі маральных паводзін, якія ўжо толькі на наступных этапах замацоўваюцца ў свядомасці. Перадача старэйшымі пакаленнямі назапашанага сацыяльнага вопыту, у тым ліку і духоўна-маральнага, адбывалася праз пэўную дзейнасць. З дапамогай канкрэтных практыкаванняў фарміраваліся станоўчыя звычкі, якія былі падмуркам народнага выхавання. Вынікі маральнага выхавання ў палешукоў падмацоўваліся звычаямі, абрадамі, народнымі святамі.

Надзвычай важнае месца ў народным выхаванні займае **метад прыкладу.** У народзе заўважалі схільнасць дзяцей да пераймання, таму стараліся, каб у жыцці пастаянна прысутнічалі ўзоры для прыкладу. У іх якасці маглі выступаць героі казак, калыханак, легендаў і іншых фальклорных твораў. Асабліва дзейсны ўплыў аказвалі ўзоры з навакольнай рэчаіснасці. Цэнтральнае месца адводзілася прыкладу бацькоў. Палешукі актыўна выкарыстоўвалі дыдактычны прыём «Рабі, як я». У якасці перасцярогі ад непажаданых дзеянняў і ўчынкаў актыўна выкарыстоўваліся адмоўныя прыклады.

У сем'ях палешукоў шырока ўжываліся такія метады, як **заахвочванне, асуджэнне** і **пакаранне.** Трэба адзначыць, што ўзнагарода, пахвала выкарыстоўваліся не так часта, затое ўзважана і абгрунтавана. У народзе лічылі, што «*лепей недахваліць, чым перахваліць*» [24], таму характар выхаваўчага ўздзеяння быў вытрыманы, строгі. Усё рабілася для таго, каб выхаванне не перарасло ў пеставанне дзяцей, бо «*з пестуна нічога не будзе*» [6, с. 133]. Любоў да дзяцей павінна спалучацца з высокай патрабавальнасцю і строгасцю: «*Любі дзіця, як душу, а калаці, як грушу*» [6, с. 134], «*Дзеці балуюцца ад матчынага блінца, а разумнеюць ад бацькавага дубца*» [6, с. 133]. У той жа час палешукі разумелі, што фізічныя пакаранні самі па сабе – неэфектыўны сродак, таму заключалі: «*Разумнае дзіця баіцца гразы, дурное – лазы*» [6, с. 135]. З гэтай нагоды досыць часта выкарыстоўваліся перасцярогі, забароны і пагрозы. Лічылася, што страх перад магчымым пакараннем засцеражэ ад непажаданых учынкаў, паступова сфарміруе пэўную лінію паводзін і ў выніку пяройдзе ў адказнасць перад уласным сумленнем.

Дзейсным сродкам выхавання з'яўлялася **вусная народная творчасць.** З маленства дзеці былі не толькі назіральнікамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі шматлікіх абрадаў. Адбывалася адначасовае ўздзеянне на розум і пачуцці дзяцей, якое істотна павялічвала эфектыўнасць выхавання. Народная педагогіка ў значнай ступені выкарыстоўвала мастацкія формы фальклору, якія праз пачуццёвае ўспрыманне ўздзейнічалі на развіццё вобразна-мастацкага мыслення, што, у сваю чаргу, садзейнічала эфектыўнаму фарміраванню маральнай свядомасці. Нядзіўна, што ў адрозненне ад інстытуалізаванага выхавання народная педагогіка сур'ёзную ўвагу ўдзяляла магічнасці. Многім рэчам і з'явам надавалася звышнатуральная сіла. Ствараўся своеасаблівы эмацыянальны фон, які шматкратна павялічваў выхаваўчыя магчымасці звычайных сродкаў. Так, вера ў «магічную сілу» слова нярэдка тварыла сапраўдныя цуды. Многія народныя прыкметы засцерагалі ад дрэнных учынкаў, скіроўвалі паводзіны ў жадаемае рэчышча.

Дзейснымі выхаваўчымі сродкамі з'яўляліся на Палессі **гутаркі, павучанні, угаворы, тлумачэнні, парады:** «*Умей дзіця радзіць, умей і вучыць*» [6, с. 135], «*Разумным дзіця не радзіцца*» [13]. Такія метады і сродкі маральнага выхавання, як благаславенне, папрок, абяцанне, клятва, праклён, адрачэнне і інш., пры ўздзеянні на эмацыянальна-пачуццёвую сферу альбо стымулявалі чалавека да самаўдасканалення, альбо садзейнічалі папярэджанню негатыўных думак і ўчынкаў.

З дахрысціянскіх часоў былі шырока распаўсюджаны шматлікія **замовы,** якія мелі мэтай справядлівае ўладкаванне грамадскага жыцця, удасканаленне яго духоўнай сферы, фарміравалі веру ў чалавечыя магчымасці і незвычайную моц роднага слова. Многія замовы накіраваны супраць амаральных якасцей і ўчынкаў: «*Ад ворагаў*», «*Ад сплетнікаў*», «*Ад п'янства*» [11, с. 26].

Істотны маральна-выхаваўчы патэнцыял таксама маюць **народныя гульні.** Многія з іх імітуюць рэальнае жыццё, адносіны паміж людзьмі, дапамагаюць развіваць маральна-валявыя якасці іх удзельнікаў.

Вялікае выхаваўчае значэнне мелі на Палессі **народныя песні,** пачынаючы з ка-

лыханак, якія фарміравалі ў дзяцей асновы светабачання. Вось прыклад адной з такіх калыханак, запісаных на Мазыршчыне:

*Люлі-люлі,*
*Усе дзеткі паснулі.*
*Адна Ганначка не спіць,*
*Я на ўгору ўсё глядзіць,*
*Думае пра мамку,*
*Думае пра татку.*
*Яшчэ думае а том,*
*Як добрэ жыць нам утраём* [20].

У песнях палешукоў значнае месца адводзіцца духоўным перажываннем і памкненням чалавека, разважанням аб чалавечых узаемаадносінах. Народныя песні раскрываюць складаныя ўзаемаадносіны ў традыцыйнай шматпакаленнай сям'і: паміж маці і дачкой, свякроўю і нявесткай, мужам і жонкай.

Як і ў іншых народаў, багаты выхаваўчы патэнцыял утрымлівалі **народныя казкі** з іх павучальным ухілам, выразным размежаваннем дабра і зла, аптымістычнай упэўненасцю ў перамозе дабра. Нездарма лічылася, што *«байкі дзяцей гадуюць»* [16].

Сапраўднай скарбонкай народна-педагагічнай мудрасці з'яўляюцца **прыказкі** і **прымаўкі**. Яны, як правіла, маюць афарыстычную форму і павучальны змест, у іх народам адабрана і выкрышталізавана ўсё каштоўнае з сацыяльна-гістарычнага вопыту, у тым ліку і з выхаваўчай практыкі. Да сённяшняга часу маўленне насельнікаў Мазырскага Палесся аздабляецца народнымі выслоўямі для падмацавання сваіх довадаў, развагаў, бо *«без прымаўкі і прыказкі гаворка, што ежа без солі»* [14]. Аналіз прыказак і прымавак палешукоў прыводзіць да высновы, што пераважная большасць з іх прама ці ўскосна скіраваныя на працэс выхавання, перш за ўсё – на маральнае ўдасканаленне асобы: *«За цярпенне дае бог спасенне»* [6, с. 231], *«Колькі смаку, столькі і граху»* [6, с. 233], *«Людзей не судзі, лепш на сябе паглядзі»* [6, с. 234], *«Як гукнеш, так і адзавецца»* [6, с. 248].

*Такім чынам, аналіз этнапедагагічнай спадчыны Мазырскага Палесся пацвярджае выснову аб існаванні самабытных выхаваўчых сістэм рэгіянальнага характару, наяўнасці ў іх разнастайных выхаваўчых падыходаў, якія заслугоўваюць увагі не толькі з пазнавальнага пункту гледжання. Яны могуць з поспехам выкарыстоўвацца ў развіцці тэорыі і практыкі сучаснай педагогікі.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**

**Літаратура**


1. *Арлова, Г.П.* Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 120 с.
2. *Васильева, А.Я.* Выдержки из жизни белорусской женщины / А.Я. Васильева // Виленские губернские ведомости. – 1877. – № 23.
3. *Волков, Г.Н.* Этнопедагогика / Г.Н. Волков. – Чебоксары: Чувашское книжное изд-во, 1974. – 376 с.
4. Десять отрывков разнообразнаго историческаго содержанія (из сочиненія) Михалона Литвина «О нравах татар, литовцев и москвитянъ» // Архив историко-юридических сведений, относящихся до России, издаваемый Н. Калачовым. – М., 1854. – Кн. 2. – С. 1–78.
5. *Дубянецкі, С.Ф.* Цяжкі шлях да адраджэння / С.Ф. Дубянецкі, Э.С. Дубянецкі. – Брэст: Выд-ва С. Лаўрова, 1997. – 92 с.
6. *Касько, У.К.* Палескі дзівасіл: бел. нар. прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы А.К. Сержпутоўскага / У.К. Касько. – Мінск: Вышэйшая школа, 2005. – 383 с.
7. Общественный, семейный быт и культура населения Полесья / Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора АН БССР, Ин-т искусствоведения, фольклора и этнографии им. Рыльского АН УССР; редкол.: Бондарчик В.К. [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1987. – 116 с.
8. Пинчуки. Этнографическій сборникъ / собр. Д.Г. Булгаковскій // Записки императорского географического общества по отделению этнографии. – Т. XIII. – Вып. 3. – СПб., 1890.

9. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кнігах / пад рэд. А.С. Фядосіка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.

10. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кнігах / пад рэд. А.С. Фядосіка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – Кн. 2. – 616 с.

11. *Сербов, И.А.* Белорусы-сакуны / И.А. Сербов. – СПб., 1915.

12. *Сержпутоўскі, А.К.* Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1999. – 191 с.

**Інфарматары**

13. *Бурміч Харыта Мікалаеўна*, 1929 г.н. (г.п. Лельчыцы).
14. *Гурын Вольга Васільеўна*, 1934 г.н. (в. Маркаўскае Лельчыцкага р-на).
15. *Гусак Таццяна Паўлаўна*, 1930 г.н. (в. Іванкаўшчына Мазырскага р-на).
16. *Дашкевіч Таццяна Пятроўна*, 1927 г.н. (г.п. Тураў).
17. *Збароўская Таццяна Васільеўна*, 1939 г.н. (в. Юравічы Калінкавіцкага р-на).
18. *Кадол Зінаіда Яўсееўна*, 1939 г.н. (в. Мялешкавічы Мазырскага р-на).
19. *Калацэй Дар'я Лук'янаўна*, 1935 г. н. (г. Мазыр).
20. *Куліцкая Любоў Фёдараўна*, 1940 г.н. (в. Дворчышча Хойніцкага р-на).
21. *Лепянская Надзея Іванаўна*, 1925 г.н. (в. Дзвіжкі Ельскага р-на).
22. *Мазай Лідзія Мікалаеўна*, 1935 г.н. (в. Чалюшкавічы Петрыкаўскага р-на).
23. *Сацура Марыя Мікалаеўна*, 1938 г.н. (в. Навасёлкі Хойніцкага р-на).
24. *Тамашова Марыя Пятроўна*, 1924 г.н. (в. Каменка Мазырскага р-на).
25. *Шмуйла Вера Яфімаўна*, 1922 г.н. (в. Сініцкае поле Лельчыцкага р-на).
26. *Ярашэвіч Вера Кандрацьеўна*, 1921 г.н. (г. Мазыр).

*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 16.01.2009.*